У Гомелі дзейнічае рашэнне, якое немагчыма выканаць

12.07.2014



Намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкаму Аксана Рудзянок

У Гомелі дзейнічае рашэнне аб парадку правядзення масавых мерапрыемстваў па якім любы жадаючы мітынгаваць альбо прыцягнуць увагу да любой праблемы абавязаны за свой кошт заключыць дамовы на абслугоўванне мерапрыемства хуткай дапамогай і на ўборку тэрыторыі. І хоць у рашэнні ўказаны канкрэтныя выканаўцы гэтых паслуг, заключыць з імі дамовы яшчэ не ўдалося нікому.

Старшыня абласной арганізацыі партыі левых "Справядлівы свет" **Уладзімір Сякерка** распачаў шараговую спробу заключыць дамовы на абслугоўванне масавага мерапрыемства, дзеля чаго кіруючыся рашэннем гарвыканкама звярнуўся да пазначаных у ім суб'ектаў.

"У сувязі з загружанасцю станцыі ў летні перыяд мы не маем магчымасці заключыць дамову на аказанне платнай медыцынскай паслугі падчас правядзення Вамі масавага мерапрыемства", - адказаў галоўны ўрач гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі **Міхаіл Прыступін.**

"Заключыць дамову на ўборку тэрыторыі пасля правядзення масавага мерапрыемства ў дадзены момант не ўяўляецца магчымым з-за вострага недахопу прыбіральшчыкаў вулічнай тэрыторыі", - адмахнуўся ад партыйцаў дырэктар прадпрыемства па ўтрыманню дарог «ГарСАП» **Аляксандр Сівакоў.**

Поўнае ігнараванне рашэння мясцовых чыноўнікаў з боку падкантрольных ім арганізацый прывялі лідэра гомельскіх "справядліўцаў" непасрэдна ў гарвыканкам.

"Рашэнне гарвыканкама не накладае на пералічаныя арганізацыі абавязацельстваў па заключэнні дамоў. Кіраўнікі гэтых арганізацый заключаюць дамовы ў кожным канкрэтным выпадку кіруючыся аб'ектыўнымі прычынамі", - паведаміла намеснік старшыні гарвыканкама **Аксана Рудзянок.**

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі

"Фактычна чыноўнікі нам кажуць, іх рашэнне дзейнічае толькі ў дачыненні да грамадзян. Арганізацыі, пералічаныя ў рашэнні, могуць яго не выконваць з аб'ектыўных прычын. Такое вось абсурднае рашэнне, такое разуменне канстытуцыйнага права грамадзян на свабоду правядзення мірных сходаў і свабоду выказвання меркаванняў дзейнічае ў Гомельскім гарвыканкаме", - пракаментаваў падзеі Уладзімір Сякерка.

Напамятаем, у Гомелі ў гэтым годзе дэмакратычная супольнасць "адзначае" 10-годдзе забароны пікетаў і мітынгаў – з 2004 году ўлады горада і вобласці не дазволілі правесці ў рэгіёне ніводнага масавага мерапрыемства.

Гомельская Вясна

ВІДЭА



БЛОГІ



ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА "ХУРАЛА" ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага пратрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

20.04.2023 Андрэй Горват з'ехаў з Беларусі. Што будзе з палацам у Нароўлі? «Новы час»

07.04.2023 Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе «Вясна»

23.03.2023 Зняў двух п'яных расейскіх вайскоўцаў – трапіў пад пераслед, але здолеў збегчы радыё «Свабода»

07.03.2023 Ксенія Луцкіна перахварэла ў калоніі на двухбаковую пнеўманію «Народная воля»

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ


08.08.2022 Пошта ЗША спыніла адпраўленні ў Беларусь

26.07.2022 «Інфармацыя пра маё затрыманне нават мяне шакавала»: ураджэнца Гомельшчыны ўжо тры месяцы трымаюць у ІЧУ ў Расеі

23.07.2022 У Польшчы знік 18-гадовы хлопец з Калінкавічаў

14.07.2022 У Кіеве заявілі аб імавернасці ўзброеных правакацый у памежных з Украінай раёнах Гомельшчыны і Берасцейшчыны

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ



ПАРТНЁРЫ

Праваабарончыя сайты: Брэст Віцебск Гародня Магілёў

© 2023 Гомельская вясна

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com